ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Т. Ю. Аброськіна**

# Асновы моўнай культуры

## 4 клас

## *Рабочы сшытак*

*Дапаможнік па факультатыўных занятках для вучняў установаў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі*

Мінск
«Сэр-Віт»
2024

# Дарагі чацверакла752снік!

Ты працягваеш вывучэнне факультатыўнага курса «Асновы моўнай культуры».

У гэтым годзе ты даведаешся пра планету Зямля, пра чалавека як асобу. Пабываеш на розных кантынентах. Даведаешся пра таямніцы мораў і акіянаў. Паглыбішся ў свет чалавечых пачуццяў і ўчынкаў. Паразважаеш пра Радзіму і прачытаеш творы пра яе абаронцаў.

Гэта дазволіць табе папоўніць моўны багаж і багаж ведаў. Пастарайся выканаць усе заданні, унікнуць у сэнс фразеалагізмаў і прыказак; рабі паведамленні і праекты. Гэта дапаможа развіваць памяць, кемлівасць, дасціпнасць, уменне працаваць з дзіцячай кнігай.

Запрашаю цябе ў незвычайнае падарожжа па старонках мастацкай, даведачнай і навукова-папулярнай літаратуры.

Жадаю табе поспеху!

# З роднай мовай па планеце

## *Тэма 1.* Сонца і Сонечная сістэма

**1.** Разгледзь ілюстрацыю. Знайдзі Сонца. Назаві планеты Сонечнай сістэмы.




**2.** Прачытай артыкул.

**Як пабудаваны наш касмічны дом?**

Мы жывём на адной з васьмі планет, якія рухаюцца вакол Сонца. Сонечнага цяпла і святла хапае ўсім жывым істотам на Зямлі. Адлегласць да яго сто пяцьдзесят мільёнаў кіламетраў. Калі б Сонца згасла, то стала б халодна. Замерзла б ўся вада і нават паветра. Загінулі б людзі, жывёлы, расліны.

Тэмпература на Сонцы такая, што металы там ператвараюцца ў раскаленыя газы. Таму на Сонцы няма цвёрдых і вадкіх рэчываў, там толькі раскаленыя газы. Высокая тэмпература будзе існаваць унутры і на паверхні Сонца яшчэ шмат тысяч стагоддзяў.

Сонечнай энергіяй награваецца паверхня мацерыкоў і акіянаў. Выкарыстанне энергіі Сонца можа прыносіць вялікую карысць гаспадарцы. Людзі прыдумалі сонечныя батарэі, цяпліцы, воданагравальнікі, сушылкі, створаны сонечныя электрастанцыі. (*Паводле дзіцячай энцыклапедыі «Я пазнаю свет».*)

**2.** Разгледзь ілюстрацыі. Назаві марскіх жывыёл. Падпішы іх.




______________________ ______________________

**3.** Разгледзь ілюстрацыі. У якім значэнні ўжыта слова «губка»? Запішы.






____________ ____________ ____________ ____________

**Работа з фразеалагізмамі**

**Губкі банцікам** – маленькі роцік з трошкі прыпаднятай верхняй губой.

**4.** Прачытай творы Валянціна Мысліўца «Дзіўны краб», «Краб і актынія».

### Дзіўны краб

Было гэта ў Міжземным моры. Матрос Жураўка, нырнуўшы глыбока ў ваду, падняў на борт карабля незвычайнага краба – з прырослай да панцыра марской губкай.

Гэта нас вельмі зацікавіла. Праз колькі дзён Жураўка з марскога дна дастаў краба, які ў сябе на спіне трымаў заднімі лапкамі вялікую губку. Яна яшчэ не паспела прырасці да панцыра.

Крабы, аказалася, маскіруюцца ад драпежнікаў жывымі губкамі. Адно пры з'яўленні якога марскога разбойніка яны хутка вызваляюцца ад лішняга груза і хаваюцца ва ўкрыццё.

Бачылі мы, як крабы падразалі губку, калі яна разрасталася і звісала з панцыра. Працавалі клюшнямі, як нажніцамі.

Матрос Жураўка прыкмеціў таксама, што ў час руху краба губка шмат спажывала харчу і хутка расла.

**2.** Знайдзі ў філвордзе назвы стыхійных бедстваў. Запішы.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| л | а | м | н | я | п |
| а | к | е | л | д | а |
| в | а | с | ь | ь | а |
| і | н | р | т | н | п |
| в | е | а | е | е | о |
| у | н | с | л | з | ў |
| л | н | е | м | е | з |
| к | а | н | | | |

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

**3.** Прачытай. Злучы фразеалагізм і яго значэнне.

| | |
|---|---|
| **Гара з плячэй звалілася** | выконваць работу, якая патрабуе вялікіх намаганняў |
| **Горы варочаць. Горы зрушыць. Звярнуць горы** | заступацца за каго-небудзь, абараняць усімі сродкамі |
| **Не за гарамі** | збаўленне ад вялікіх клопатаў, перажыванняў |
| **Стаяць гарой** | штосьці блізкае, што хутка наступіць, з'явіцца |
| **Як на каменную гару** | спадзявацца, абапірацца на каго-небудзь |

**4.** Прачытай апавяданне Валянціна Мысліўца «Галодныя арлы».

### Галодныя арлы

Гэтую праяву я назіраў у Каўказскіх гарах на ўзбярэжжы Чорнага мора...

Была раніца ціхага летняга дня. З карабля добра праглядалася вяршыня, на якой збудавалі сваё гняздо арлы. Сонечныя промні нібы залацілі арліцу, пад распушчанымі крыламі якой скігаталі, просячы корму, маладыя арляняты.

Нерухома сядзеў на скале непадалёку ад гнязда арол-бацька. Ён углядаўся на белаватую палоску, якая расла на ўсходзе ўздоўж далёкага марскога гарызонта.

Птушак стамляў голад. Стоенае мора корму не давала. Далёкія палёты над сушай прыносілі жабрацкую здабычу. Ні рыбы ў вадзе, ні дзічыны на беразе!

**Гібоны**

Нібы па ліянах, па вяроўках
У вальеры малпы скачуць лоўка.
Віснуць, спрытна ўгору лезуць.
То гібоны, дзівакі-гарэзы.
Слаўныя гімнасты і артысты.
Ім прыемна, што на іх глядзіш ты.





## *Тэма 13.* Вандруем па планеце. Краіны Блізкага и Сярэдняга Усходу

**1.** Прачытай часткі слоў. Дапішы назвы краін.

Егі_____, Ізра_____, Лі_____, Йе_____, Сі_____, Тур_____, Іра_____, Іра_____.

**2.** Прачытай інфармацыю пра Іран і Егіпет.



**Іран.** Доўгі час краіна называлася Персіяй. Гэтая дзяржава стаяла ля вытокаў сусветнай цывілізацыі. Гісторыя яе налічвае 5 тысяч гадоў.

Самы папулярны помнік Ірана – старадаўні горад Персеполіс. Ён быў заснаваны каля 560 года да нашай эры па загаду цара Персіі Дарыя І. Будавалі горад 6 гадоў вольныя будаўнікі, якія прыязджалі з усёй імперыі. Найбольш вядомы палац Ападана. Яго залы былі такімі вялікімі, што своды палаца падтрымлівалі 72 калоны. А на сценах былі высечаны сцэны з жыцця персідскіх цароў, іх ваенныя паходы.



**Егіпет** мае багатую гісторыю. Да нашых дзён захаваліся піраміды і іншыя помнікі старажытнасці, якім больш за 6000 гадоў.

Піраміды – гэта ўсыпальніцы фараонаў, егіпецкіх цароў. Такіх збудаванняў знойдзены сотні. Самая старая – піраміда Хеопса, ёй прыкладна 4500 гадоў.

Здраднік паліцай данёс немцам на маці, маіх бабуль і дзядулю, што яны дапамагаюць партызанам. Таксама паказаў карнікам акопы, у якіх хавалася моладзь. Маці і дзядулю на допыце да чарнаты збілі ножкай крэсла і гумавай палкай. Бабуль хацелі павесіць, цудам уратаваліся. У акоп з моладдзю – сем дзяўчат і хлопец – карнікі пусцілі газ. Хлопец уцёк. Пераканаўшыся, што гэта не партызаны, фрыцы пайшлі з паліцаем да іншых акопаў.

Вельмі цяжка паміралі дзяўчаты. Тры маці страцілі па дзве дачкі, чацвёртая – адзіную дачушку. Іх пахавалі ў брацкай магіле. Паліцая партызаны пакаралі.

У лясной зямлянцы з калючай пасцеллю я, мой васьмігадовы брат і наш дванаццацігадовы дзядзька некалькі начэй былі адны. «Смалінка-слязінка ўпала з сасны. Без маці ў зямлянцы спяць дзеці вайны. І ёлкі, і сосны да самага ранку ледзь чутна спявалі малым калыханку» – гэта радкі маёй паэмы «Пра дзяўчыну Галінку». Вялікае гора, агромністыя страты і цяжкія пакуты вынес наш народ. Вайна забрала ў мяне бацьку, трох братоў і сястру, падарвала здароўе маці, бабулям, дзядулям і мне. Няма даравання вайне!

**3.** Прачытай артыкулы пра подзвігі дзяцей у час Вялікай Айчыннай вайны.



*Зіна Партнова* ў пачатку вайны стала партызанкай. У 15 гадоў дзяўчынка працавала ў сталовай нямецкага навучальнага корпуса і па заданні падполля атруціла ежу. Сто фашысцкіх афіцэраў памерлі. Зіну вылічылі і накармілі атручаным супам, але яна цудам выжыла. Зіну злавілі і прыгаварылі да расстрэлу. Перад смерцю яе доўга катавалі.



*Валодзю Дубініну* ў пачатку вайны было 14 гадоў. Юнак быў партызанам і разведчыкам. Герой падарваўся на нямецкай міне падчас размініравання каменяломні разам з сапёрамі.



*Марат Казей* у 13 гадоў асірацеў, загінула маці. Хлопчык падаўся ў партызаны і разведчыкі. Сястра Марата дапамагала параненым, але атрымала моцнае абмаражэнне ног. Яе эвакуіравалі, але ногі прыйшлося ампутаваць. Марат адмовіўся ехаць з сястрой і застаўся помсціць за маці. У 1943 годзе Марат выратаваў партызанскі атрад. У 1945 годзе ён падарваў сябе гранатай, трапіўшы ў акружэнне.



*Надзя Багданава* – самае малое дзіця-герой. 9-гадовая дзяўчынка бадзялася па вёсках у пошуках ежы, трапіла да партызан і стала ім дапамагаць. Аднойчы немцы злавілі яе разам з напарнікамі па разведцы. Дзяцей доўга катавалі і прыгаварылі да расстрэлу, але дзяўчынцы цудам удалося пазбегнуць смерці. У 1943 годзе маленькая партызанка ўдзельнічала ў падрыве

– Паглядзіце за маё хатай, – папрасіла яна. – Я да Акуліны схаджу. Даўно не бачылася з ёю…

– Добра, добра, паглядзім, – у адзін голас сказалі дзяўчынкі.

Акуліну бабка Мар'я дома не застала і вярнулася дамоў. Зайшла на двор – дзверы хаты зачынены.

– Хто ж гэта там? – занепакоілася старая.

Заходзіць у хату, а там суседскія дзяўчынкі Анька, Валька і Танька падлогу мыюць.

«Вось хто мне памагае, – з удзячнасцю падумала бабка Мар'я. – Якія слаўныя дзяўчынкі!»

**4.** Прачытай. Злучы пачатак і канец прыказкі. Выберы тую, якая адлюстроўвае галоўную думку твора Івана Сіняўскага. Адзнач знакам «+».

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☐ | Сам добры – людзі | | колка |
| ☐ | У добрага чалавека заўсёды многа добрых | | добрыя |
| ☐ | Шчыраму сэрцу і чужая болька | | людзей |



## *Тэма 21.* Чалавек і яго якасці: смеласць

**1.** Прачытай артыкул.

Звычайныя людзі могуць праявіць смеласць у надзвычайнай сітуацыі Напрыклад, усім вядомы подзвіг Ромы Кагадоўскага: у час пажару 12-гадовы хлопчык вынес з агню малодшага брата.

Рома быў увесь абгарэлы. Пашкоджана было болей 50 працэнтаў скуры, глыбокія парэзы. Але, дзякуючы урачам, хлопчык занава навучыўся сядзець і хадзіць. Хлопчык узнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць».

**2.** Прачытай байку Эдуарда Валасевіча «Хлопчык і кацянё».

**Хлопчык і кацянё**

Ёсць людзі добрыя, ёсць людзі злыя…
Напэўна, хтосьці з чорнаю душой
Укінуў ранняю вясной,
Калі імчалі крыгі ледзяныя,

## *Тэма 25.* Чалавек і яго блізкія: браты, сёстры

**1.** Адгадай загадку Міхася Пазнякова. Запішы адгадку.



Для таты і для мамы – дачушка,
Маленькая гэта пястушка.
А хто яна мне? Вельмі рад,
Што я для яе – родны брат.

(________________)

**2.** Прачытай. Злучы кожны фразеалагізм з яго значэннем.

| | |
|---|---|
| **На брата** | пра смелага, незалежнага чалавека |
| **Ні брат, ні сват** | на кожнага (па адным яблыку на брата) |
| **Сам чорт не брат** | зусім чужы, не родны |

**3.** Прачытай вершы.

### Акрабат



Мой брат
Сапраўдны акрабат.
Пры ім і я
Старацца рад:
Раблю ўжо мосцік
І шпагат.

Хачу такім быць
Акурат,
Як брат мой –
Акрабат.
(*С. Валодзька.*)

### Блізняты

Два браты, Тарас і Бора, –
Сябрукі заўзятыя.
Не пазнаеш, дзе каторы,
Бо растуць блізнятамі.

Бора – здольны матэматык,
Мовазнаўцам слыў Тарас.
І пры выпадку брат брата
Выручалі кожны раз.

Матэматык лепшы ў класе,
Бора слаўна працаваў
І задачы за Тараса
На выдатна ён рашаў.



А калі на ўроку мовы
Бору клікалі – якраз
За яго заўжды гатовы
Пастарацца быў Тарас.

Ды аднойчы сябрукі
Свой сакрэт раскрылі.
Смех у класе быў такі!
Школу ўсю здзівілі.

Разабраць складаны сказ
Па часцінах мовы
Быў пакліканы Тарас,
А браты пайшлі абодва.



Ёсць Маршак, Біянкі, Волкаў,
Ліндгрэн, Твен, Радары, Толкін.
Ёсць і казкі ўсіх народаў,
Ёсць фантастыка, прыгоды.

На паліцах кніг палова
Пазнавальна-навуковых.
І калі часінку маю,
З асалодаю чытаю.
І сярод сяброў маіх
Шмат герояў гэтых кніг.

Дзень надарыцца няўдачны –
Не бядую і не плачу.
Супакой мой не ў аптэцы,
А ў маёй бібліятэцы.

**2.** Разгледзь ілюстрацыі літаратурных герояў. Злучы героя з аўтарам, які яго стварыў.

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Лазар Лагін | Астрыд Ліндгрэн | Алан Аляксандр Мілн | Джані Радары |

**3.** Прачытай верш Міколы Мятліцкага «Усяслаў Чарадзей».

**Усяслаў Чарадзей**

Мне тата кніжку прачытаў
Пра князя з іменем Усяслаў.
Зямлю ён полацкую славіў,
Сабор у горадзе паставіў
І з Кіева за ноч ваўком
Прымчаўся ў Полацк – родны дом.
Таму здабыў сярод людзей
Назоў вось гэты – Чарадзей.



Усяслаў Полацкі.
Мастак Язэп Драздовіч

# *Тэма 29.* Чалавек і яго справы. Дасягненні чалавека ў мастацтве

**1.** Прачытай артыкулы.

**Напалеон Орда**



Нарадзіўся 11 лютага 1807 года ў радавым маёнтку Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерніі. Быў вельмі таленавітым чалавекам: перакладчыкам, музыкантам, мастаком. Альбомы яго літаграфій змяшчаюць больш за 200 твораў, якія прысвечаны архітэктуры Беларусі. Напалеон Орда зрабіў больш за 1150 замалёвак, эцюдаў і акварэляў краявідаў, гарадоў і мястэчак, славутых мясцін тагачаснай Беларусі.

**Вітольд Бялыніцкі-Біруля**



Нарадзіўся 12 лютага 1872 года ў фальвараку Крынкі Магілёўскага павета.

Акадэмік жывапісу, народны мастак Беларусі, вядомы на ўвесь свет. Вітольд Бялыніцкі-Біруля вучыўся ў Кіеўскім кадзецкім корпусе. Кожныя канікулы праводзіў у бацькоўскім маёнтку на Беларусі. Тут ён напрацаваў шматлікія эцюды, накіды і адпрацоўваў сваё майстэрства.

Яго палотны цяпер зберагаюцца ў дзясятках калекцый розных краін. А ў Магілёве створаны персанальны вялікі музей мастака. Сотні яго пейзажаў сталі нацыянальнай беларускай спадчынай.

**Марк Шагал**



Нарадзіўся ў Віцебску ў 1887 годзе.

Стварыў цэлы шэраг малюнкаў, прысвечаных Віцебску. Мастак называў свае замалёўкі дакументамі. Ён адлюстроўваў тысячы дробязей у выглядзе дамоў, людзей і жывёл!

Стварыў у 1919 годзе ў Віцебску мастацкую школу, якая потым ператварылася ў Беларускі мастацкі тэхнікум. Яго скончылі дзясяткі славутых мастакоў.



Напалеон Орда
«Мірскі замак»



Вітольд Бялыніцкі-Біруля
«Зімні сон»



Марк Шагал
«Над горадам»